Ірына Поўх

ВОБРАЗ РУСАЛКІ Ў ПАЭЗІІ НУАЛЫ НІ ГОНАЛЬ

Русалкі – адзін з універсальных фальклорных вобразаў, які існуе ў культуры розных краін. Напрыклад, у славянскай гэта прыгожыя дзяўчаты, што могуць заказытаць да смерці або звесці за сабой у ваду. Японцы сцвярджаюць, што, калі з'есці русалку, можна стаць несмяротным. У ісландскім фальклоры прысутнічаюць Marbendlar, русалкі-мужчыны. Шырокую распаўсюджанасць атрымаў вобраз русалкі і ў культуры Брытанскіх астравоў, дзе ён сімвалізуе пагрозу і небяспеку. Русалкі прадракаюць бяду ці нават самі выклікаюць яе. Як сцвярджаюць паданні, некаторыя з іх – пачварныя істоты памерам да 160 футаў.

У ірландскім фальклоры русалкі больш рамантызаваныя. Лічылася, што яны могуць ператварацца ў людзей, зняўшы сваю марскую вопратку. Ірландскія русалкі не закалыхваюць людзей да смерці, але часта самі становяцца ахвярамі іх жорсткасці, калі людзі хаваюць вопратку русалкі, каб яна не змагла вярнуцца ў ваду. Некаторыя ірландскія сем'і сцвярджаюць, што вядуць свой род ад русалак, і змяшчаюць іх выявы на сваім фамільным гербе [1].

Вобраз русалкі – адзін з цэнтральных у творчасці Нуалы Ні Гональ, сучаснай ірландскай паэткі. Ён з'яўляецца лейтвобразам зборніка «Пяцідзесяціхвілінная русалка» («The Fifty Minute Mermaid»), дзе вада, якую русалкі пакінулі, выступае сімвалам гісторыі, мінулага, традыцыйнай ірландскай культуры. Зборнік уяўляе сабой цыкл вершаў, што апісваюць жыццё русалкі ад яе выхаду з вады і жыцця сярод людзей да смерці. Праз гэты вобраз Нуала Ні Гональ перадае сваё стаўленне да драматычных змен, што адбываюцца ў сучасным грамадстве і ўплываюць на звыклы лад жыцця. З матывам русалак звязаны розныя побытавыя тэмы: смяротнасць сярод немаўлят, жывёлагадоўля, адукацыя, абрады (хрышчэнне), народныя прыкметы і прымхі (забарона ўносіць камяні ў хату ў панядзелак, класціся нагамі да агню і інш.).

У творчасці Нуалы Ні Гональ адзначаны вобраз выступае індыкатарам асноўных маральных праблем, што хвалююць паэтку і знаходзяць увасабленне ў яе творчасці. Значнае месца ў ірландскай паэзіі належыць праблеме стаўлення людзей да сваёй гістарычнай спадчыны, асабістай адказнасці кожнага за яе заняпад. У сваіх вершах Нуала Ні Гональ праводзіць паралель паміж людзьмі, што пакінулі сваю радзіму, страцілі свае карані, сувязь са сваёй культурай, аднак не асіміляваліся, і русалкамі, якія выйшлі на сушу, далучыліся да людзей і забыліся, што такое вада, але людзьмі так і не сталі: вершы «Памяць пра ваду» («Cuimhne an Uisce»), «Русалкі і выкормліванне малаком» («Na Murúcha agus an Bainne Cíche»).

Яшчэ адзін аспект, якому надаецца асаблівая ўвага ў творчасці Нуалы Ні Гональ, – суадносіны паміж традыцыйным і новым, шляхі ўключэння народнай культуры ў сучаснасць, прыстасаванне яе да рэалій мяжы XX–XXI

стагоддзяў. Так, фея выкрадае мужчыну, сеўшы да яго ў машыну пад выглядам спадарожніцы і спакушаючы камп'ютарамі, відэакасетамі і фотаапаратамі («Фея, што вандруе аўтаспынам»/«Bean an Leasa mar Shíobshiúlóir»), сячэ дрэва сякерай фірмы «Black & Decker» («Дрэва»/«An Crann»), кладзе вопратку ў пральную машыну («Выкраданне»/«Fuadach»), русалкі карыстаюцца касметыкай («Русалка і яе дачка»/«An Mhurúch is a hiníon»).

Адзін з лейтматываў творчасці Н. Ні Гональ у цэлым і зборніка «Пяцідзесяціхвілінная русалка» ў прыватнасці – роля паэта ў сучасным грамадстве, яго місія як захавальніка мовы і культуры нацыі, прадстаўніком якой ён з'яўляецца. У вершы «Русалкі і выкормліванне малаком» Н. Ні Гональ падкрэслівае непарыўную сувязь паміж паэтам і яго сям'ёй, родам, асяроддзем: «*Do chloisfeá na filí acu ag cur síos de shíor // is ag caint ar "fhoinse shíoraí bainne na mbó mbleacht*» 'Чуваць, як паэты ўсхваляюць бясконца // кароў, іх малочных крыніц невычэрпнасць' [2, *42*]). Імкненне ірландцаў захаваць сваю мову, зберагчы яе для нашчадкаў перадаецца ў вершы «Русалка і яе дом»/«An Mhurúch is a Tigh» Н. Ні Гональ праз такую дэталь, як шыльды з надпісамі, што змяшчаюцца на сценах пакояў у хаце і адлюстроўваюць каштоўнасці той ці іншай сям'і. Паэтка гаворыць: «*Má tá Gaeilge agat labhair í*» 'Калі валодаеш ірландскай, размаўляй на ёй' [2, *126*].

Пытанню станаўлення і развіцця ірландскамоўнага слоўнага мастацтва, актуальнай для паэткі праблеме захавання традыцый прыгожага пісьменства, у прыватнасці вуснай народнай творчасці і ананімнай літаратуры, прысвечаны верш Н. Ні Гональ «Русалкі і літаратура»/«Na Murúcha agus an Litríocht». Ідэя занядбання і страты твораў старажытнай літаратуры перадаецца праз адмоўныя дзеяслоўныя канструкцыі («*níor luíodar riamh leis an litríocht*» 'не стварылі літаратуры', «*níor chumadar is níor cheapadar*» 'не стварылі і не склалі', «*nach bhuil aon dul siar*» 'немагчымасць вяртання', «*is cé nach mbeidh a leithéidí arís ann*» 'такіх тут не будзе', «*ní scríobhann siad dréachta filíochta ná caibidilí leabhar*» 'не пішуць ні вершы, ні прозу' [2, *38*]), а таксама ўжыванне эмацыйна афарбаваных слоў з адмоўнай канатацыяй («*scorn*» 'зневажаць', «*aithreachas*» 'шкадаванне', «*caitheamh*» 'жалоба', «*cáiseamh*» 'аплакваць' [2, *38*]).

Н. Ні Гональ нярэдка будуе свае творы па прынцыпе бінарных апазіцый: мужчына – жанчына, традыцыі – навацыі, паэт – грамадства, ірландская – англійская мова, свой – чужы. Адной з праяў кампанента «чужы» выступае вобраз выгнанніка. У вершы «Русалкі і выкормліванне малаком» праз вобраз русалак, што выйшлі з вады ў свет людзей, падкрэсліваецца пачуццё страты, беспрытульнасці, нявызначанасці стану. Апавядальнасць, што з'яўляецца адметнай уласцівасцю паэзіі Нуалы Ні Гональ, прысутнічае і тут праз стварэнне замалёвак з жыцця русалак на зямлі, апісванне іх заняткаў жывёлагадоўляй, выяўлення пачуцця гонару, уласнай значнасці. Імкненне русалак да новага жыцця, іх жаданне прыстасавацца да нязвыклых умоў перадаецца праз адпаведны лексічны рад: «*na gcaimileon*» 'хамелеоны', «*a gcumas aithrise*» 'прыстасавальнасць' [2, *42*]. Тым

не менш, апошнім радком паэтка падкрэслівае ілюзорнасць гэтай сітуацыі і светаадчування: «*Pé sórt dúile eile a dhein díobh, níor dhein daoine díobh*» ‘істоты, якімі яны сталі, былі не людзьмі’ [2, *42*]).

Стаўленне Н. Ні Гональ да сваёй радзімы перадаецца праз шэраг эмацыйна афарбаваных эпітэтаў. У вершы «Памяць пра ваду» пачуццё, выкліканае згадкай пра страчаную радзіму, характарызуецца як «*strus uafásach*» ‘жудасны стрэс’ [2, *30*], лексічны рад, з дапамогай якога апісваюцца эмоцыі, што ўзнікаюць у выніку страты сваіх каранёў, радзімы, звычаяў і традыцый, у вершы «Русалкі і літаратура» складаецца з наступных адзінак: «*aithreachas*» ‘шкадаванні’, «*caitheamh*» ‘смутак’, «*cáiseamh*» ‘жалóба’ [2, *38*].

Такім чынам, вобраз русалкі ў зборніку Н. Ні Гональ «Пяцідзесяціхвілінная русалка» выступае своеасаблівай квінтэсенцыяй яе паэзіі, што ўбірае ў сябе ўсю праблематыку творчасці паэткі папярэдніх гадоў – праблему зберажэння нацыянальнай гістарычнай і культурнай спадчыны, захавання статусу роднай мовы, уключэння традыцыйнай народнай культуры ў сучаснасць, місіі паэта ў грамадстве.

ЛІТАРАТУРА

1. Кельтская мифология: энциклопедия / пер. с англ. С. Головой и А. Голова; редкол.: Е. Басова (отв.ред.) [и др.]. М., 2005.
2. *Ní Dhomhnaill, N.* The Fifty Minute Mermaid / N. Ní Dhomhnaill. Old Castle, 2007.